Несомненно, исполнение такой музыки обязательно найдет положительный эмоциональный отклик в душах слушателей и самих поющих. Поэтому нам представляется бесспорным, что пение в хоре произведений духовного содержания благотворно отражается на психическом здоровье детей и способствует укреплению в подрастающей личности хороших нравственных основ и моральных принципов.

**А. В. Няборская,**
*аспірантка*

## АБРАДАВЫ ТЭАТР І ЯГО ПЕРСАНАЖЫ

Тэатр Беларусі арганічна звязаны з агульным развіццём мастацкай культуры народа. На працягу стагоддзяў дзве асноўныя плыні – народнае і прафесійнае тэатральнае мастацтва – вызначалі характар гэтай формы нацыянальнай ідэалогіі. Усе яго віды па-свойму служылі розным класам і сацыяльным праслойкам, адлюстроўвалі ў драматычным дзеянні складанасць палітычных ідэй, эстэтычных паняццяў, народных уяўленняў аб светабудове, а таксама псіхалогію, міфалогію і паэтычную творчасць народа. Асноўнай крыніцай тэатральнай творчасці ў Беларусі былі абрады. Народныя формы тэатра – выступленні скамарохаў, батлейка, кірмашовы тэатр, народная драма – былі цесна звязаны з народнай абраднасцю і гульнямі.

Святочныя ўрачыстасці аб'ядноўвалі два тыпы абрадавых дзей: язычніцкія і хрысціянскія, пазацаркоўныя і царкоўныя. Побач з пышнымі богаслужэннямі ў храмах, упрыгожаных маляўнічымі фрэскамі, дзе можна было пачуць спевы псалмоў, суседнічалі народныя святы, на якіх часта гаспадарылі першыя народныя акцёры – скамарохі. Яны былі арганізатарамі і ўдзельнікамі "бясоўскіх ігрышчаў" – русаллі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адных з самых старажытных абрадаў, прысвечаных культу вады, агню, русалак і сонца.

Да прыходу хрысціянства вобраз русалкі лічыўся адным з важнейшых у славян-язычнікаў побач з такімі вобразамі, як Ярыла ці Купала. Усе вераванні пра яе зафіксаваны ў песнях, якія цесна звязаны з каляндарнымі абрадамі і святамі. Важны цыкл абрадаў быў звязаны менавіта з "праводзінамі русалак". У славянскай этнаграфіі добра вядома, што ў дні такіх русальных свят у вёсках выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, упрыгожвалі яе зялёнымі галінкамі, кветкамі, вянкамі і з магічнай мэтай аблівалі вадой, як бы імітуючы дождж, які хацелі выклікаць такімі дзеяннямі. Абрад праводзін русалкі існаваў у вялікай колькасці варыянтаў.

Ужо ў старажытнасці былі вядомы дзве разнавіднасці ўвасаблення абрадава-міфалагічнай фігуры русалкі: выяўленчая і тэатральная. Першая – саламянае пудзіла-русалка, матэрыялам для якой служылі салома, лыка, каноплі, хворост, бярозкі. Лялька прыбіралася, насаджвалася на стоўб ці калок і станавілася падобнай на чалавека. Такую русалку потым "праводзілі": кідалі ў жыта, тапілі ў рацэ ці спальвалі на вогнішчы.

Тэатральнае ўвасабленне было больш распаўсюджаным. На ролю русалкі выбіралі дзяўчыну з доўгімі валасамі. Яе ўпрыгожвалі кветкамі, на галаву ўскладалі вялізны вянок, вялі ў карагодзе за ваколіцу, да жытнёвага поля, дзе і пачыналася дзеянне. Абрады заўсёды суправаджаліся песнямі, прытопваннем, стукам. Калі была магчымасць, у абрадзе абавязкова прысутнічала дуда, у крайнім выпадку – скрыпка. Абрады з русалкамі арганічна ўваходзілі ў веснавое свята расліннасці, завяршаючы сабой пераход ад вясны да лета.

Дарэчы, большасць сюжэтаў для абрадавага тэатра бярэцца менавіта з каляндарнай і сямейнай абраднасці. Вядомы земляробчыя абрады севу і жніва, калі на поле выходзілі з працэсіямі і там служылі малебен. Свае звычаі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напрыклад, былі пры звозе хлеба: каля варот пасцілалі велікодны абрус, асвячалі вадой месца, дзе складаўся хлеб, кідалі туды камень, каб не заводзіліся мышы. Калі ўсё было звезена, накрывалі стол з выпіўкай і закускамі, кланяліся іконам, спявалі і танцавалі.

Існавалі абрады нараджэння дзіцяці, ткацкія, вясельныя і інш. Гэтыя святы мелі непасрэдную сувязь з тэатральнымі відовішчамі. У такіх прадстаўленнях ужо быў акцёр-выканаўца, карыфей-запявала, ён жа з'яўляўся цэнтральнай фігурай карагодаў. У некаторых сцэнах удзельнічалі некалькі акцёраў-выканаўцаў. Самыя актыўныя назначаліся рэжысёрамі-арганізатарамі і пастаноўшчыкамі гульнёвых сцэн. У некаторых абрадах іх называлі ўраднікамі, на вяселлях – свахамі-сватамі, на радзінах – бабкамі.

У аснове абрадавага тэатра ляжаць сюжэты драматычныя, прыметай якіх з'яўляецца наяўнасць мастацкага вобраза і драматычнай дзеі, а адным з асноўных элементаў тэатральнага дзеяння – пераапрананне. Яно было распаўсюджана па ўсёй Беларусі і мела неабмежаваную колькасць варыянтаў. Таму і абрадавы тэатр быў шматпланавым і рознахарактарным. Хадзілі з "казой", з "жоравам", пераапранутымі "цыганамі". Са спевамі і скокамі пад скрыпку і гітару ўсхвалялі гаспадароў, "цыганкі" варажылі, прасілі "пазалаціць" руку. З дапамогай мудрагелістых касцюмаў удзельнікі свята ператвараліся ў цыган, жабракоў, жывёл (мядзведзяў, коз, коней), дзяўчаты пераадзяваліся ў мужчынскае адзенне. Выраблялі берасцяныя маскі, валасы з пянькі, аўчыны, мазалі твары сажай, мелам, вугалем.

Адзін з самых папулярных абрадаў у Беларусі – "Каза". Гэта, можна сказаць, цэлае абрадавае харэаграфічна-тэатралізаванае прадстаўленне, у якім прымаюць удзел розныя персанажы: Каза, Воўк, Заяц, Ліса. Разам з імі праважатыя – Дзед, Цыган, Цыганка, Механоша, пераапранутыя хлопцы, жанкі, дзяўчаты, мужчыны,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абавязкова музыка. Удзельнікі свята ходзяць па вуліцы і па хатах, спяваючы песні. Самы цікавы элемент гэтай дзеі – танец Казы, да якога паступова далучаюцца іншыя дзеючыя асобы ў адпаведнасці з тэкстам песні: "Выскачыў ваўчок, за козаньку чок... Выскачыў заяц, стаў казу лаяць..."

Як можна заўважыць, каляндарныя народныя абрады, якія ўзніклі ў глыбокай старажытнасці, паступова трацілі сваё выключна магічнае значэнне. У іх усё больш выяўлялася тэатральная аснова. Гэта былі ўжо невялікія сцэны з акрэсленым сюжэтам, канфліктам, а іх гульнёвае ўвасабленне ўключала многія аспекты тэатралізацыі – падбор дзеючых асоб, пераапрананне (спецыяльны касцюм ці яго элементы, маска, грым), рэквізіт, выбар месца. Часта само дзеянне будавалася па законах драматургіі. Напрыклад, "Тураўскі карагод" складаецца з наступных частак: 1) прыгатаванне каравая і яго ўпрыгожванне (завязка дзеяння); 2) шэсце па вёсцы з караваем і чырвонай тканінай (развіццё); 3) ваджэнне карагода ў полі (кульмінацыя); 4) выкананне песні (развязка і фінал).

У залежнасці ад спецыфікі абрада замест каравая маглі фігураваць страла ("Ваджэнне і пахаванне стралы"), куст ("Ваджэнне куста"), маладая (вясельны абрад) і інш.

З цягам часу назіраецца імкненне да паказу вялікіх відовішчаў. У тэатральным побыце з'яўляецца жаданне ствараць цэлыя спектаклі, якія патрабуюць спецыяльнай падрыхтоўкі і вялікай колькасці выканаўцаў, рэквізіту і спецыяльнага адзення. Нараджаецца асобы тып тэатральных відовішчаў – прадстаўленне народных драм, матэрыялам для якіх былі нацыянальны фальклор і абрадавы тэатр. Беларуская народная драматургія, таксама як руская і украінская, складвалася з сацыяльна значных твораў гераічнага і сатырычнага характару: "Цар Максіміліян", "Лодка", "Сляпы Лазар", "Поп, парабак, пан і разбойнік" і інш. Выконваліся творы ў спецыяльных касцюмах, не патрабавалася падрыхтаванай сцэны і дэкарацый. Беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай драме былі ўласцівыя спалучэнне элементаў трагедыі і фарса, натуралістычных дэталей і ўмоўных прыёмаў, своеасаблівы стыль акцёрскага выканання: падкрэслены жэст, гратэскавыя рысы знешнасці і паводзін, фарсіраваны гук і своеасаблівая, напеўная дэкламацыя.

Багацейшая культура нашай краіны ўвабрала ў сябе галоўныя ідэі хрысціянства, а таксама традыцыйныя эстэтычныя погляды народа, устойлівыя вобразы язычніцкай міфалогіі. На працягу амаль усёй гісторыі існавання хрысціянства царкоўнікі і афіцыйныя ўлады вялі барацьбу з народнымі святамі, гульнямі і звычаямі. Але царква не магла знішчыць народную абраднасць. Абрадавы тэатр з'яўляецца найбольш кансерватыўным і архаічным пластом народнай спадчыны, у якім добра захаваліся сляды міфалагічных уяўленняў чалавека, язычніцкіх культаў старажытнасці.

**В.М.Пешков,**
*доцент*

## О ЛОГИЧЕСКОЙ ФОРМЕ ЗАКОНОВ ПОЗНАНИЯ И ПРОБЛЕМ
### (к истории славянской атомологии)

Законы познания и научная проблема связаны, но эта их связь может быть вскрыта и констатирована при точном формулировании законов познания и определения научной проблемы на формализованном языке логики высказываний. Для того, чтобы вскрыть эту связь и квалифицировать ее, сначала построим формулу основополагающего закона познания, как мы его называем за его роль в процессе познания.

Итак, допустим, что некоторый конкретный ученый обнаружил неизвестный науке феномен (фрагмент реальности) и точно описал его (построил новые истинные



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ